Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

17 ЛІПЕНЯ 2009 г. ПЯТНІЦА № 131 (26489)

Кошт 600 рублёў

ВЫДАЕЦЦА З 9 ЖНІЎНЯ 1917 г.

«Прамая лінія»

## СЯМ'Я, ДЗЕЦІ, ДАПАМОГА

Апошнім часам статыстыка адзначае паступовы рост нараджальнасці. А адсюль — і павелічэнне цікавасці да тэмы сацыяльнай падтрымкі сем'яў і дзяцей. Дапамогі па доглядзе, бясплатнае харчаванне для дзяцей ва ўзросце да 2 гадоў, дадатковыя гарантыі працоўнага заканадаўства бацькам — аб усім гэтым і іншым мы прапануем пагутарыць падчас «прамой лініі» газеты «Звязда» з удзелам **начальніка аддзела народанасельніцтва, гендарнай і сямейнай палітыкі Міністэрства працы і сацыяльнай абароны Аляксандры Васільеўны ЛІСОЎСКАЙ** і **кансультанта гэтага ж аддзела Марыны Барысаўны АРЦЁМЕНКІ.**

**УВАГА! Паводле папярэдняй дамоўленасці, наша «прамая лінія» пройдзе 21 ліпеня з 15 да 16 гадзін па рэдакцыйных тэлефонах (8 017) 292 38 21 і 292 38 92. Папярэднія пытанні прымаюцца па нумары (8 017) 287 17 57.**

«Прамая лінія»

## ЯКІЯ ХВАРОБЫ ПАГРАЖАЮЦЬ ВАЧАМ НАШЫХ ДЗЯЦЕЙ

Сёння ўсё больш дзяцей становяцца пацыентамі афтальмолагаў. Якія прычыны зніжэння зроку ў дашкольнікаў? Як пазбегнуць зрокавых перагрузак падлеткам? Ці маецца генетычная схільнасць да тых або іншых захворванняў вачэй? Што рабіць, калі зрок пачаў падаць? На гэтыя і іншыя пытанні, звязаныя з работай органаў зроку ў дзяцей, падчас «прамой лініі» адкажа **галоўны дзіцячы афтальмолаг Міністэрства аховы здароўя, доктар медыцынскіх навук, дацэнт кафедры афтальмалогіі БелМАПА Вікторыя Леанідаўна КРАСІЛЬНІКАВА.**

***«Прамая лінія» адбудзецца СЁННЯ з 15.00 да 16.00 па нумарах 8 (017) 292 38 92 і 292 38 21.***

Аляксандр ЛУКАШЭНКА:

# БЕЛАРУСЬ ПА ЎКАРАНЕННІ НАВУКОВЫХ НАВІНАК ПАВІННА ІМКНУЦЦА БЫЦЬ НА КРОК НАПЕРАДЗЕ ІНШЫХ КРАІН

**Беларускія вучоныя павінны больш актыўна ўкараняць уласныя распрацоўкі, уносіць стратэгічныя прапановы па развіцці айчыннай навукі, умацаванні дзяржавы, інтэлектуальным і духоўным узбагачэнні людзей. Аб гэтым заявіў Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка 16 ліпеня, уручаючы дыпломы выбраным акадэмікам і членам-карэспандэнтам Нацыянальнай акадэміі навук.**

Склад НАН не абнаўляўся ўжо амаль 5 гадоў. Як адзначыў кіраўнік дзяржавы, цяперашняму выбранню акадэмікаў і членаў-карэспандэнтаў папярэднічаў вельмі карпатлівы і дасканалы адбор кандыдатур. «Было нямала і інтрыг, і спроб «прапіхнуць сваіх», націску аўтарытэтаў як з чыноўніцкага, так і навуковага асяроддзя. Усё гэта неабходна было рашуча адмесці і выбраць сапраўды таленавітых і плённа працуючых вучоных», — сказаў Аляксандр Лукашэнка.

Вучоныя, якія прысутнічалі на сустрэчы, вядомы сваімі перадавымі тэхналогіямі ў прамысловасці і сельскай гаспадарцы, вырошчванні новых гатункаў раслін, распрацоўцы эфектыўных метадаў лячэння захворванняў, трансплантацыі сэрца, фундаментальнымі работамі ў юрыспрудэнцыі, эканоміцы, гуманітарных навуках, адкрыццямі і вынаходствамі. У прыватнасці, сярод нававыбраных акадэмікаў такія выдатныя вучоныя, як Сяргей Абламейка, Барыс Хрусталёў, Аляксандр Мрочак, Арнольд Смеяновіч, Мікалай Мышкін, Яўген Маруковіч, Мікалай Круцько, Алег Івашкевіч, Сяргей Чаранкевіч, Уладзімір Улашчык, Аляксандр Цыганоў. Прэзідэнт уручыў таксама дыпломы 24 членам-карэспандэнтам НАН.

Аляксандр Лукашэнка нагадаў, што яшчэ ў пачатку 2000-х гадоў былі сфармуляваны дакладныя і жорсткія патрабаванні да адбору вучоных. Менавіта тады пачалося кардынальнае рэфармаванне сістэмы кіравання навукай і пастаўлены бар'ер тэндэнцыі, што намецілася, да дэвальвацыі звання вучонага. «Гэта павінен быць конкурс не высокіх пасад, не гучных прозвішчаў, а рэальных навуковых дасягненняў і творчых патэнцыялаў, — сказаў кіраўнік дзяржавы. — Бо не сакрэт, што вучоныя ступені і званні рознымі хітрымі спосабамі, выкарыстоўваючы адміністрацыйныя рычагі, часта атрымлівалі тыя, для каго навука абмяжоўвалася толькі гучнымі рэгаліямі ў візітнай картцы і разнастайнымі льготамі».

Паводле слоў Прэзідэнта, у гэтым годзе было як ніколі шмат прэтэндэнтаў на акадэмічныя званні, што дало магчымасць стварыць па-сапраўднаму канкурэнтнае асяроддзе, прад'яўляць сапраўды высокія патрабаванні і выбраць найбольш дастойных вучоных па ўсіх напрамках. Ён выказаў надзею, што такі патрабавальны падыход да адбору кандыдатур дасць станоўчы вынік у далейшай рабоце беларускіх вучоных.

Аляксандр Лукашэнка падкрэсліў, што невыпадкова развіццю навукі ўдзяляецца такая пільная ўвага на вышэйшым узроўні. «Ад гэтай важнейшай сферы залежыць сучаснасць і будучыня краіны, якасць жыцця людзей», — дадаў кіраўнік дзяржавы.

Канкурэнтаздольнасць дзяржавы ў сучасным свеце вызначаюць навука і інавацыі, падкрэсліў Прэзідэнт. Беларусь выбрала стратэгію інавацыйнага развіцця, і сёння ў краіне ні адно рашэнне не прымаецца без належнага навуковага аналізу. «Скорасць навукова-тэхнічнага прагрэсу сёння такая, што краінам, якія адстаюць, пагражае не толькі эканамічны спад, але і пастаянная тэхналагічная залежнасць ад лідараў гэтай бесперапыннай гонкі, ад тых, хто задае тэмпы і напрамкі эвалюцыі ўсёй сусветнай супольнасці», — сказаў Прэзідэнт.

Ён адзначыў, што аб'ёмы фінансавання даследаванняў бесперапынна нарошчваюцца, аднак, пры гэтым дзяржава мае права разлічваць на адэкватную аддачу ад вучонай супольнасці. «Мы не можам траціць бюджэтныя грошы на так званыя навуковыя даследаванні з адмоўнымі або нулявымі вынікамі, мы не можам няньчыцца з няўдачнікамі і халтуршчыкамі. Калі навука лічыцца перадавым рубяжом прагрэсу, то і ў пытаннях эфектыўнасці работы яна павінна паказваць прыклад усім галінам і сферам народнай гаспадаркі», — падкрэсліў Аляксандр Лукашэнка.

Кіраўнік дзяржавы лічыць, што найбольш аптымальным шляхам развіцця навуковых арганізацый павінна стаць фарміраванне навукова-вытворчых комплексаў і буйных цэнтраў, якія забяспечаць не толькі распрацоўку, але і выпуск інавацыйнай прадукцыі. Пры гэтым ні ў якім выпадку нельга дапусціць разбурэння навуковых школ, якія ўжо склаліся. Іх неабходна падтрымліваць, знаходзіць ім прыкладное прымяненне ў краіне, не дапускаючы адтоку высокакваліфікаваных навуковых кадраў за мяжу.

Паводле слоў Прэзідэнта, адна з найважнейшых задач Нацыянальнай акадэміі навук і ўсіх вучоных — стварэнне і ўкараненне перадавых вытворчых тэхналогій, ініцыяванне навуковых праектаў самага высокага ўзроўню. Дзяржава заўсёды знойдзе сродкі на рэалізацыю такіх праектаў, але і аддача ад іх павінна быць самая максімальная, падкрэсліў ён.

***(Заканчэнне на 2-й стар.)***

# СА СВЯТАМ, ГРОДНА!



Фота БЕЛТА.

*65-ю гадавіну вызвалення Гродна ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў адзначаюць у горадзе над Нёманам.*

## Раўненне на герояў Перамогі

**16 ліпеня, у Дзень горада, калі ў Гродне традыцыйна святкуецца кожная чарговая гадавіна вызвалення ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў, адбылася прэзентацыя кнігі «Раўненне на герояў Перамогі». 17 ліпеня яна з удзелам ветэранаў вайны і моладзі будзе прэзентавана ў музеі Брэсцкай крэпасці, а 18 ліпеня — у музеі гісторыі Вялікай Айчыннай вайны ў Мінску.**

Гэта выданне — вынік сумеснай працы Гродзенскага гарвыканкама і прэфектуры Паўднёвай адміністрацыйнай акругі Масквы, Гродзенскага дзяржаўнага ўніверсітэта імя Янкі Купалы і Маскоўскай акадэміі эканомікі і права. У ВНУ актыўна працуюць клубы «Радзіма» і менавіта падчас сумеснага пасяджэння прынята рашэнне аб падрыхтоўцы такой кнігі. У ёй надрукаваныя аповеды пра салдатаў і афіцэраў Вялікай Айчыннай і іх успаміны, у тым ліку і малавядомыя ў расійскай і беларускай гісторыяграфіі факты. Першы раздзел прысвечаны аперацыі «Баграціён».

**Барыс ПРАКОПЧЫК.**

Ёсць праблема!

# МАЛОЧНЫ ГРАДУС

**На гарачы тэлефон пазваніў наш <u>чытач Міхаіл МЯДЗВЕДСКІ</u> з вёскі Кучын Быхаўскага раёна. І падзяліўся праблемай, якая ўзнікла пры здачы малака з асабістага падворку. Сітуацыя такая: па трох вёсках ездзіць малаказборшчык і прымае ў насельніцтва малако. А потым прыязджае машына з малаказавода і забірае малако ў малаказборшчыка. Але цяпер пачалі патрабаваць, каб тэмпература малака не перавышала 10 градусаў па Цэльсію. Вяскоўцы малако і ў лядоўню кладуць, і ў бітоны бутэлькі з лёдам кідаюць, але ўсё адно, пакуль малаказборшчык праедзе па некалькіх вёсках, малако паспявае нагрэцца на сонцы.**




Міхаіл Іванавіч і папрасіў даць рады: як быць у такой сітуацыі, як улічыць інтарэсы і завода, і вяскоўцаў?

— Я ўдзельнік вайны, мне 83 гады, аднак нейкую гаспадарку маю — вось карову сваю трымаю. Унукаў шмат, ім дапамога патрэбна. А цяпер малаказавод выстаўляе такія патрабаванні, якія ў летні час выканаць цяжка.

Каб разабрацца ў сітуацыі, мы спачатку звярнуліся на ААТ «Быхаўмалако», якое займаецца прыёмам малака. **Таццяна САКУРАВА, начальнік лабараторыі** расказала, што яны маюць права прымаць малако толькі ў адпаведнасці з патрабаваннямі СТБ-1598 — яго тэмпература не павінна быць больш за 10 градусаў.

Раней, калі не прад'яўляліся строгія патрабаванні да якасці прадукцыі (у тым ліку і Расіяй), то на зборнае малако ад насельніцтва таксама не звярталі шмат увагі. Ну а цяпер усё толькі па стандартах. Дарэчы, у Быхаўскім раёне збіралася нарада з удзелам старшынь сельскіх Саветаў, прадстаўнікоў завода і мясцовых калгасаў. Аднак і там не змаглі вырашыць праблему з ахалоджаннем малака — пытанне ўпіраецца ў фінансы.

У Чарнаборскім сельскім Савеце, куды адносіцца вёска Кучын, сказалі, што малаказборшчыкі, якіх цяпер чатыры, падпарадкоўваюцца з нядаўняга часу СВК «Быхаўскі». А ў самога сельскага Савета няма ні адпаведнай базы, ні магчымасці закупіць халадзільнікі. У СВК «Быхаўскі» таксама сказалі, што выдзеліць ці закупіць якія-небудзь тэрмасы-бітоны ці халадзільнікі для малака ад насельніцтва ў іх няма фінансавых магчымасцяў, ледзь-ледзь змаглі забяспечыць ахалоджванне малака ад калгасных кароў. У прынцыпе, пазіцыя СВК зразумелая — ад здадзенага людзьмі малака прыбытак атрымліваюць самі вяскоўцы, калгас жа тут ні пры чым.

У Інстытуце мяса-малочнай прамысловасці, які займаўся распрацоўкай СТБ-1598, патлумачылі, што патрабаванні па тэмпературы існавалі заўсёды, нават у савецкіх ДАСТах. Але ці прыслухоўваліся да іх — гэта ўжо іншае пытанне. Ахалоджваць жа малако — проста неабходна, каб яно не губляла ўсе свае якасці дый проста не псавалася.

Па праўдзе сказаць, мы не ведаем, што і параіць вяскоўцам. Патрабаванні СТБ мяняць ніхто не будзе, гэта зразумела. Значыць, трэба думаць, як іх выконваць. Ці самім неяк скідвацца і закупляць халадзільнікі (для сябе ці якія-небудзь аўтаномныя для малаказборшчыка), ці дамаўляцца пра гэта з малаказаводам або СВК. Яшчэ ўдалося даведацца, што нібыта на малаказаводы, якія будуць займацца пастаўкамі малака ў РФ і за мяжу, наогул не будуць прымаць зборнае малако. Яго будуць перапрацоўваць на спецыяльна вызначаных малаказаводах, што не займаюцца экспартам. Але пакуль гэта толькі планы, якія могуць і не ажыццявіцца. Можна паспрабаваць змяніць графік прыезду машыны ад малаказавода — каб яна прыязджала раней, калі яшчэ не такая спёка. Але гэтыя планы ўзгодненыя з усімі старшынямі сельскіх Саветаў, і да ўсіх вяскоўцаў прыехаць у адзін і той жа час проста немагчыма — чыёсьці малако ўсё адно паспее нагрэцца.

Паколькі ўсе спецыялісты адзначалі, што аналагічная сітуацыя склалася не толькі ў Быхаўскім раёне, але па ўсёй краіне, то, магчыма, на праблему збору малака з асабістых падворкаў трэба звярнуць увагу Міністэрству сельскай гаспадаркі. Разгледзець яе комплексна і знайсці выйсце, каб улічваліся інтарэсы і магчымасці ўсіх бакоў — вяскоўцаў, малаказаводаў і калгасаў. Ну а пакуль параіць Міхаілу Іванавічу і тым, хто апынуўся ў такой сітуацыі, можам толькі адно — спадзявацца на свае сілы, самім ахалоджваць малако (хаця б і абкладваннем лёдам) і шукаць выйсце разам з эканамічнымі партнёрамі — малаказаводам і мясцовай уладай.

А, магчыма, недзе ёсць цікавы вопыт? Пішыце ў «Звязду».

**Павел БЕРАСНЕЎ.**

РОЗГАЛАС — АПОШНЯЯ ІНФАРМАЦЫЯ СУТАК

## СПЯКОТА ДА 34° ПЛЮС МОЦНЫЯ ДАЖДЖЫ

**На працягу ліпеня на тэрыторыі Беларусі ўсталёўвалася вельмі цёплае і нават спякотнае надвор'е.**

Сёння ўдзень праз тэрыторыю краіны пройдзе атмасферны фронт і стане крыху свяжэй, паведаміла рэдакцыі **начальнік аддзела метэаралагічных прагнозаў Рэспубліканскага гідраметцэнтра Людміла ПАРАШЧУК.**

Месцамі чакаюцца кароткачасовыя дажджы з навальніцамі. Максімальная тэмпература паветра 23—28, па Гомельскай вобласці — да 31 градуса. А вось у суботу Беларусь трапіць у зону павышанага ціску, таму ападкаў не будзе ўвогуле. Тэмпература паветра ўначы 11—18, удзень 26—31, па поўдні краіны да 34 градусаў. Сіноптыкі папярэджваюць, што такая гарачыня на фоне амаль 40-працэнтнай вільготнасці паветра лічыцца не зусім камфортным надвор'ем для здароўя. Таму спецыялісты раяць менш знаходзіцца пад адкрытым сонцам і піць больш вады.

Ужо ў нядзелю праз нашу краіну пачне рухацца істотны атмасферны фронт. Таму ў нядзелю ўначы па заходняй палове краіны, а ўдзень паўсюдна чакаюцца дажджы, месцамі моцныя ліўні. Паўднёвы вецер зменіцца на заходні, а пры навальніцах будзе назірацца шквалістае ўзмацненне ветру. Тэмпература паветра ўначы 15—22, удзень — ад 18—20 на захадзе да 32—34 градусаў на ўсходзе краіны.

У панядзелак на ўсёй тэрыторыі краіны адбудзецца змена паветраных мас і спякота адыдзе далей на ўсход. Дажджоў стане менш. Тэмпература паветра ўначы 11—18, удзень 19—26. Згодна з папярэднімі прагнозамі, у аўторак—сераду надвор'е будзе фарміравацца пад уплывам вільготнага, але халаднаватага паветра з боку Атлантыкі. Тэмпература паветра ўначы 9—15, удзень — ад 16—17 на поўначы да 20—24 цяпла на поўдні краіны.

**Сяргей КУРКАЧ.**

## ВЫПАЎ З КАБІНЫ МАЗа

**Трагічна скончылася паездка на грузавіку для 32-гадовага гамяльчаніна, якога згубіў... у тым ліку моцны напой.**

Здарэнне было зафіксавана на дарозе паблізу вёскі Беліца Жлобінскага раёна. Пацярпелы, які быў, мякка кажучы, нецвярозым, выпаў з кабіны МАЗа, якім кіраваў вясковец з Гомельскага раёна. Мужчына ў выніку здарэння загінуў.

Яшчэ трое загінулых — вынік ДТЗ на дарозе паблізу вёскі Янчукі Шчучынскага раёна. Тут кіроўца «Аўдзі», мужчына 1976 года нараджэння, пры выездзе на галоўную дарогу сутыкнуўся з аўтамабілем «Сканія». Для кіроўцы і яго двух пасажыраў гэтая аварыя стала ракавой — яны загінулі. Яшчэ двое пасажыраў — 1991 і 1994 гадоў нараджэння — змешчаныя ў бальніцу.

**Ігар ГРЫШЫН.**

## САДАВОДАЎ ЗАРЭГІСТРУЮЦЬ ДА 2012 ГОДА

**Як паведаміў карэспандэнту «Звязды» <u>намеснік старшыні Дзяржаўнага камітэта па маёмасці Беларусі Андрэй ГАЕЎ,</u> кіраўніком нашай дзяржавы днямі быў падпісаны Указ № 350, які ўдакладняе правілы дзейнасці садаводчых таварыстваў.**

У прыватнасці, гэтым дакументам тэрмін для рэгістрацыі правоў на зямельныя ўчасткі ў садаводчых таварыствах працягнуты да 1 студзеня 2012 года. Такое рашэнне тлумачыцца тым, што сёння права на зямлю зарэгістравала толькі крыху больш як палова членаў садаводчых таварыстваў.

Улічваючы звароты кіраўнікоў і членаў садаводчых таварыстваў, указам спрашчаецца працэдура прыёму — перадачы ад садаводчых таварыстваў у рэспубліканскую ўласнасць высакавольтных электрычных сетак і трансфарматарных падстанцый, эксплуатацыя якіх была пачата да 8 мая 2003 года.

Андрэй Гаеў адзначыў, што, згодна з нормамі ўказа, садаводы, якія не зарэгіструюць свае зямельныя ўчасткі да першых дзён 2012 года, могуць страціць іх на карысць дзяржавы.

**Сяргей КУРКАЧ.**

БЕЛВНЕШЭКОНОМБАНК

ТРАДИЦИИ НАДЕЖНОСТЬ КОМПЕТЕНТНОСТЬ

**БУХГАЛТЕРСКИЙ БАЛАНС на 1 июля 2009 года**

*ОАО «Белвнешэкономбанк» г. Минск, ул. Мясникова, 32*

(в миллионах белорусских рублей)

| № п/п | Наименование статьи | Символ | на 01.07.2009 | на 01.07.2008 |
|---|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 |
| 1 | АКТИВЫ | | | |
| 2 | Денежные средства | 1101 | 68857,9 | 52408,5 |
| 3 | Средства в Национальном банке | 1102 | 73172,6 | 105204,2 |
| 4 | Ценные бумаги | 1103 | 30424,3 | 5346,0 |
| | для торговли | 11031 | 0,0 | 0,0 |
| | удерживаемые до погашения | 11032 | 0,0 | 0,0 |
| | в наличии для продажи | 11033 | 30424,3 | 5346,0 |
| 5 | Кредиты и другие средства в банках | 1105 | 293750,9 | 125882,9 |
| 6 | Кредиты клиентам | 1106 | 1261618,2 | 904393,8 |
| 7 | Долгосрочные финансовые вложения | 1107 | 5095,3 | 3399,9 |
| 8 | Основные средства и нематериальные активы | 1108 | 77253,7 | 64219,3 |
| 9 | Прочие активы | 1109 | 15818,9 | 13419,2 |
| 10 | ИТОГО АКТИВЫ | 110 | 1825991,8 | 1274273,8 |
| 11 | ОБЯЗАТЕЛЬСТВА | | | |
| 12 | Средства Национального банка | 1202 | 504,7 | 8309,1 |
| 13 | Кредиты и другие средства банков | 1205 | 414252,1 | 384531,2 |
| 14 | Средства клиентов | 1206 | 912331,6 | 741290,8 |
| 15 | Ценные бумаги, выпущенные банком | 1208 | 5887,0 | 1762,4 |
| 16 | Прочие обязательства | 1209 | 34237,3 | 22436,5 |
| 17 | ВСЕГО обязательства | 120 | 1367212,7 | 1158330,0 |
| 18 | КАПИТАЛ | | | |
| 19 | Уставный фонд | 1211 | 327483,0 | 24157,9 |
| 20 | Эмиссионный доход | 1212 | 0,0 | 0,0 |
| 21 | Резервный фонд | 1213 | 20879,1 | 13173,0 |
| 22 | Накопленная прибыль | 1214 | 55997,7 | 35007,7 |
| 23 | Фонд переоценки статей баланса | 1215 | 44419,3 | 43605,2 |
| 24 | ВСЕГО капитал | 121 | 458779,1 | 115943,8 |
| 25 | ИТОГО обязательства и капитал | 12 | 1825991,8 | 1274273,8 |
| 26 | ТРЕБОВАНИЯ И ОБЯЗАТЕЛЬСТВА НА ВНЕБАЛАНСОВЫХ СЧЕТАХ | | | |
| 27 | Требования | 1301 | 564525,2 | 439882,6 |
| 28 | Обязательства | 1302 | 408240,9 | 419009,5 |

**ОТЧЕТ О ПРИБЫЛИ И УБЫТКАХ на 1 июля 2009 года**

*ОАО «Белвнешэкономбанк» г. Минск, ул. Мясникова, 32*

(в миллионах белорусских рублей)

| № п/п | Наименование статьи | Символ | на 01.07.2009 | на 01.07.2008 |
|---|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 |
| 1 | Процентные доходы | 2011 | 92411,3 | 49462,2 |
| 2 | Процентные расходы | 2012 | 48250,8 | 28718,0 |
| 3 | Чистые процентные доходы | 201 | 44160,5 | 20744,2 |
| 4 | Комиссионные доходы | 2021 | 29391,7 | 23750,4 |
| 5 | Комиссионные расходы | 2022 | 3532,7 | 3090,5 |
| 6 | Чистые комиссионные доходы | 202 | 25859,0 | 20659,9 |
| 7 | Чистый доход по операциям с иностранной валютой | 203 | 16245,6 | 7770,6 |
| 8 | Чистый доход по операциям с ценными бумагами | 204 | 35,4 | 88,4 |
| 9 | Доход в форме дивидендов | 205 | 1175,5 | 34,8 |
| 10 | Чистые отчисления в резервы | 206 | 7051,9 | 22,3 |
| 11 | Прочие доходы | 207 | 11871,3 | 5789,9 |
| 12 | Операционные расходы | 208 | 47661,7 | 35948,7 |
| 13 | Прочие расходы | 209 | 12333,7 | 4126,6 |
| 14 | Налог на прибыль | 210 | 8343,1 | 4317,6 |
| 15 | ПРИБЫЛЬ (УБЫТОК) | 2 | 23956,9 | 10672,6 |

**И.о. Председателя Правления** **В.В. Заяш**

**И.о. главного бухгалтера** **Е.Н. Астрякова**

*Лицензия Национального банка Республики Беларусь на осуществление банковской деятельности № 6 от 27.10.2006. УНП 100010078.*

БЕЛАРУСБАНК

**Открытое акционерное общество «Сберегательный банк «Беларусбанк», расположенное по адресу: 220050, г. Минск, ул. Мясникова, 32,**

**СООБЩАЕТ О ПРОВЕДЕНИИ 23 ИЮЛЯ 2009 ГОДА ВНЕОЧЕРЕДНОГО ОБЩЕГО СОБРАНИЯ АКЦИОНЕРОВ В ЗАОЧНОЙ ФОРМЕ СО СЛЕДУЮЩЕЙ ПОВЕСТКОЙ ДНЯ:**

*1. Об оказании безвозмездной (спонсорской) помощи.*

*2. О внесении изменений в решение внеочередного Общего собрания акционеров ОАО «АСБ Беларусбанк» от 21.09.2007 г.*

Акционеры ОАО «АСБ Беларусбанк» могут ознакомиться с информацией по вопросам повестки дня и заполнить бюллетень для заочного голосования (до 21 июля), а также с решениями, принятыми внеочередным Общим собранием акционеров банка (после 23 июля) по адресу: г. Минск, ул. Мясникова, 32, комн. 704(в), а также в филиалах — областных (Минском) управлениях, филиалах банка.

***Дата окончания приема бюллетеней — до 21 июля 2009 года.***

**Телефоны для справок: (8 017) 218 84 38, 218 84 73.**

*УНП 100325912*

# ГРАН-ПРЫ Ў ЮНАЙ РУМЫНКІ

**Гран-пры (5 тысяч долараў) на дзіцячым конкурсе «базару» атрымала прадстаўніца Румыніі — 9-гадовая Марыя** (на фота).

Першая прэмія (тры тысячы долараў) — у Андраніка Алексаняна з Украіны. Другая прэмія (2000 долараў) — у нашай зямлячкі — самай юнай удзельніцы конкурсу — Марыі Новік. Трэцюю прэмію журы вырашыла падзяліць паміж Анель Каршыгаевай з Казахстана і Каміле (Літва). Яшчэ адна беларуская канкурсантка — Лаліта разам з расіянінам Робікам атрымала прыз ад Парламенцкага Сходу Саюзнай дзяржавы Беларусі і Расіі.

**Аляксандр ПУКШАНСКІ.**




Фота БЕЛТА.

## НА «БАЗАРЫ» БУДЗЕ ДЗЕНЬ ГЕРМАНІІ?

Ужо ў наступным годзе на «базары» задумалі арганізаваць Дзень Германіі, такі ж насычаны падзеямі, як і ўжо традыцыйныя Дні Беларусі, Расіі, Украіны. Такая даволі нечаканая ідэя абмяркоўвалася падчас дзелавых сустрэч бургамістра Кацi Волі з кіраўніцтвам гарвыканкама і дырэкцыяй «базару». А нямецкія інвестары вельмі зацікавіліся прапановай укласці грошы ў рэканструкцыю і развіццё квартала ў Віцебску, дзе знаходзіцца дом-музей сям'і Шагала.

*Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 17.07.2009 г. (для б/н разлікаў)*

| | |
|---|---|
| ▼ 1 долар ЗША | 2 845,00 |
| ▼ 1 еўра | 4 010,88 |
| 1 латвійскі лат | 5 718,59 |
| 1 літоўскі літ | 1 159,10 |
| 1 чэшская крона | 154,78 |
| 1 польскі злоты | 930,19 |
| ▲ 1 расійскі рубель | 89,76 |
| 1 украінская грыўня | 366,03 |

*Курсы замежных валют для безнаяўных разлікаў*

**Цэнтрабанк РФ**

| | |
|---|---|
| USD | 31,6943 |
| 10 UAH | 40,9223 |
| 1000 BYR | 11,0858 |
| EUR | 44,6066 |

Агенцтва Уладзіміра Граўцова

*Падпішыцеся на часопіс «Главный Бухгалтер. ГБ» на 2009 год у рэдакцыі па самай выгаднай цане. Тэлефон рэдакцыі: 209-69-01.*

*ААТ «Агенцтва Уладзіміра Граўцова» УНП 100024047 Ліцэнзія Мінсувязі № 02140/0172806 выд. 03.05.2004 да 02.05.2009*

ISSN 1990 - 763X

# БЕЛАРУСЬ ПА ЎКАРАНЕННІ НАВУКОВЫХ НАВІНАК ПАВІННА ІМКНУЦЦА БЫЦЬ НА КРОК НАПЕРАДЗЕ ІНШЫХ КРАІН

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Аляксандр Лукашэнка заклікаў вучоных адыходзіць ад затратных метадаў: прайшоў той час, калі аб узроўні развіцця навукі меркавалі толькі па колькасці капіталаўкладанняў і датацый. Галоўнае сёння — рэзультатыўнасць навуковых даследаванняў. Менавіта таму неабходна імкнуцца быць на крок наперадзе іншых краін па ўкараненні навінак, знаходзіць самыя выгадныя рашэнні актуальных практычных задач з выкарыстаннем айчыннай сыравіны, вытворчых магутнасцяў, кадравых рэсурсаў.

На думку Прэзідэнта, Беларусь ужо ў бліжэйшыя некалькі гадоў павінна значна рушыць наперад у найбольш перспектыўных навуковых напрамках. Беларускім вучоным неабходна перайсці ад лабараторных эксперыментаў да прамысловага ўкаранення ўласных распрацовак і продажу інтэлектуальнага прадукту на сусветным рынку. Разам з тым ад вучоных чакаюць не толькі новых тэхналогій і матэрыялаў, але і стратэгічных прапаноў па развіцці беларускай навукі, умацаванні дзяржавы, інтэлектуальным і духоўным узбагачэнні людзей. Даследчык павінен мець асаблівую інтуіцыю, ставіць і вырашаць задачы перспектыўнага характару, падкрэсліў Аляксандр Лукашэнка.

«Атамная энергетыка, лазеры, суперкамп'ютары — добра. Але згадзіцеся, гэта ўжо існуючы вынік, сённяшні дзень. Для ўстойлівага эканамічнага развіцця краіны патрэбны прынцыпова новыя тэхналогіі: субмікронная электроніка, святлодыёды, нана- і біятэхналогіі, генетычныя метады атрымання новых гатункаў раслін і парод жывёл, вадародная энергетыка, касмічныя тэхналогіі і многае іншае», — сказаў кіраўнік дзяржавы. Вырашаць гэтыя задачы трэба будзе не толькі цяперашнім акадэмікам і членам-карэспандэнтам, але і маладому папаўненню вучоных.

Вучоным ужо цяпер неабходна ўшчыльную заняцца прапрацоўкай перспектыў развіцця краіны на наступную пяцігодку, падкрэсліў Аляксандр Лукашэнка. Перш за ўсё трэба прадугледзець найбольш эфектыўныя крокі па мадэрнізацыі беларускай эканомікі з улікам пераадолення наступстваў глабальнага крызісу, іншых пагроз і выклікаў сучаснасці.

Звяртаючыся да вучоных, Прэзідэнт звярнуў увагу на тое, што кожны год яны павінны выдаваць новы навуковы прадукт. Менавіта гэта будзе служыць крытэрыем таго, што выбраны сапраўды дастойныя вучоныя. Ён дадаў, што іх галоўнай задачай таксама з'яўляецца «пакінуць пасля сябе шлейф маладых вучоных, якія будуць прадаўжаць пачатыя справы».

Пасля цырымоніі ўручэння дыпломаў адбылася гутарка кіраўніка дзяржавы з нававыбранымі акадэмікамі і членамі-карэспандэнтамі. Вучоныя расказалі Прэзідэнту аб існуючых сёння нявырашаных праблемах у навуковай супольнасці, выступілі з шэрагам важных ініцыятыў.

Аляксандр Лукашэнка чарговы раз нагадаў, што галоўнай умовай для правядзення навуковых даследаванняў застаецца іх актуальнасць, упэўненасць у практычным выніку. На фінансаванне такіх першачарговых праектаў будуць адшуквацца сродкі.

Прэзідэнт падкрэсліў, што ў краіне існуюць сферы, фінансаванне якіх ні ў якім выпадку не будзе скарочана нават ва ўмовах сусветнага крызісу: гэта сельская гаспадарка, ахова здароўя і адукацыя.

**Прэс-служба Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.**

НУ І НУ!

## КАНТРАБАНДА НА... ЛЁСЦЫ

**Бясследны спосаб перамяшчэння тавару праз мяжу вынайшлі кантрабандысты. Пра гэта паведаміў начальнік прэс-службы Лідскага пагранатрада маёр Алег АНАЦКІ.**

У Воранаўскім раёне беларускім і літоўскім памежнікам сумеснымі намаганнямі ўдалося прадухіліць унікальную спробу пераправіць кантрабандны тавар з Беларусі ў Літву. Двое сутак група правяла ў засадзе, але парушальнікі не аб'явіліся. Аднак выпадкова была знойдзена нацягнутая капронавая лёска. Пацягнуўшы за яе, памежнікі выцягнулі вяроўку, тая ў сваю чаргу прывяла да схаваных у яме пад галінкамі і лісцем сумак. У іх памежнікі знайшлі 1 тыс. пачкаў цыгарэт з акцызнымі маркамі РФ. Кантрабандысты, знаходзячыся па абодва бакі мяжы, збіраліся волакам перацягнуць тавар з Беларусі ў Літву, пры гэтым самі б фізічна мяжу не парушылі. Паводле слоў Алега Анацкага, памежнікам упершыню давялося сутыкнуцца з такім дасканалым спосабам кантрабанды.

**Таццяна ВІШНЕЎСКАЯ, БЕЛТА.**

# НА З'ЕЗДЗЕ БЕЛАРУСАЎ СВЕТУ ЧАКАЕЦЦА КАЛЯ 330 ДЭЛЕГАТАЎ

Пяты з'езд беларусаў свету пройдзе ў Мінску 18—19 ліпеня. Удзельнікі разгледзяць прапановы да закона аб суайчынніках за мяжой. Закон аб суайчынніках, які цяпер знаходзіцца на дапрацоўцы, павінен будзе абараняць беларусаў замежжа. На з'ездзе будзе абмеркавана стварэнне спецыяльнага камітэта па справах беларускіх дыяспар за мяжой, падтрымка СМІ беларускіх суполак замежжа, праблемы захавання гісторыка-культурнай спадчыны, святкаванне 600-годдзя Грунвальдскай бітвы, якое адбудзецца ў наступным годзе. Пра гэта паведаміла прэс-сакратар міжнароднага грамадскага аб'яднання «Згуртаванне беларусаў свету «Бацькаўшчына» Таццяна ПЕЧАНКО

— Сёлетні з'езд вызначаецца вялікай колькасцю дэлегатаў, — кажа Таццяна Печанко. — Чакаем 330 дэлегатаў з 20 краін свету. Дакладную колькасць удзельнікаў і краін можна будзе назваць ужо толькі пасля самога з'езда. Прадстаўнічымі па колькасці будуць дэлегацыі Расіі, Польшчы, Літвы, ЗША, Канады.

Запрошаны на з'езд **упаўнаважаны па справах рэлігій і нацыянальнасцяў Леанід ГУЛЯКА** паведаміў, што абавязкова прыйдзе на пасяджэнні са сваімі прапановамі.

— Мы будзем ствараць пры ўпаўнаважаным Каардынацыйны савет кіраўнікоў беларускіх суполак замежжа. Праект загада і палажэнне аб Каардынацыйным савеце падрыхтавана. Ёсць ужо і 11 чалавек, якія згадзіліся быць у яго складзе. Я спецыяльна не падпісваў гэты загад, ведаючы пра з'езд беларусаў замежжа. І ў выступленні сваім я хачу запрасіць усіх зацікаўленых супрацоўнічаць з намі, у тым ліку і прадстаўнікоў згуртавання «Бацькаўшчына». Па-другое, я хачу, каб мы ў Беларусі правялі фестываль беларусаў свету. Гэта значыць запрасіць калектывы, выканаўцаў, задзейнічаць у ім усю краіну. Я ўпэўнены, што ідэю з задавальненнем падтрымаюць на ўсіх узроўнях. Задача будзе складаная ў фінансавым плане, але трэба ўсё пралічыць і прадумаць. Я хацеў бы пабачыць рэакцыю на гэту прапанову з боку беларускіх суполак за мяжой.

Беларусь падтрымлівае кантакты з многімі суполкамі беларусаў за мяжой. Некаторых фінансава падтрымлівае. З Расіяй, Літвой, Украінай, Малдовай падпісаны міжведамасныя пагадненні аб дапамозе беларускім суполкам. Са свайго боку Беларусь абавязалася дапамагаць нацыянальным суполкам гэтых краін у Беларусі.

Колькасць беларусаў замежжа складае 3,5 млн.

**Настасся ЗАНЬКО.**

# ПРАМЫСЛОВАСЦЬ: РЭЗКАЕ ПАВЕЛІЧЭННЕ ЗАПАСАЎ БЫЛО Ў СТУДЗЕНІ...

**Пачынаючы з 1996-га і па гэты год беларуская прамысловасць набірала «ачкі», устойліва нарошчваючы аб'ёмы вытворчасці. Аднак яшчэ з другой паловы мінулага года, калі ў справу «ўмяшаўся» сусветны крызіс, тэмпы росту вытворчасці галіны замарудзіліся, а са студзеня 2009-га было адзначана іх зніжэнне. Пра гэта журналістам паведаміў намеснік старшыні Нацыянальнага статыстычнага камітэта Беларусі Віктар МІХНО, які распавёў на прэс-канферэнцыі пра вынікі працы прамысловасці ў першым паўгоддзі гэтага года.**

Беларуская прамысловасць рэальна адчувае подых крызісу: за першыя шэсць месяцаў у параўнанні з адпаведным леташнім перыядам з 10 яе буйных галін зніжэнне аб'ёмаў вытворчасці назіраецца ў шасці — электраэнергетыцы, чорнай металургіі, машынабудаванні і металаапрацоўцы, лясной, дрэваапрацоўчай і цэлюлозна-папяровай, прамысловасці будматэрыялаў і лёгкай прамысловасці. З 22 падгалін не дапусцілі зніжэння толькі сем, сярод якіх нафтаперапрацоўчая, хімічная і цэментная. Са станоўчымі тэмпамі росту паўгоддзе завяршылі Віцебская і Гомельская вобласць, поспех якіх у многім завязаны на выніковасці працы нафтаперапрацоўкі.

Сітуацыя на знешніх рынках, дзе звужаецца попыт на прадукцыю вытворцаў, паўплывала і на суадносіны запасаў гатовай прадукцыі і сярэднямесячнай вытворчасці прамысловых прадпрыемстваў. У першым паўгоддзі, зазначыў Віктар Міхно, у фактычных цэнах яны склалі 94,6 працэнта пры заданні 69. Між іншым, рэзкае павелічэнне запасаў прыпала на першы месяц года і з таго часу яны змяняюцца неістотна. Разам з тым, у асобных галінах прамысловасці гэты паказчык складае значна большую велічыню. Так, найбольш крызіс адбіўся на машынабудаванні і металаапрацоўцы, дзе запасы гатовай прадукцыі складаюць каля 185 працэнтаў ад сярэднямесячнага аб'ёму вытворчасці; у лёгкай прамысловасці гэта 219 працэнтаў, а вось у цукровай яны наогул перавышаюць сярэднямесячны аб'ём вытворчасці ў 5,6 раза.

Характарызуючы сённяшнія тэндэнцыі ў прамысловасці, Віктар Міхно схіляецца да думкі, што цяпер сітуацыю ўдалося тут стабілізаваць. Ён патлумачыў, што тэмп росту прамысловасці ў студзені-лютым у параўнанні з адпаведным леташнім перыядам склаў 95,3 працэнта, у студзені-сакавіку — 95,5, у студзені-маі — 96,6. Тое, што па выніках паўгоддзя тэмпы знізіліся на 0,2 працэнта і склалі 96,4 працэнта, паводле слоў намесніка старшыні Белстата, не сведчыць пра пагаршэнне сітуацыі. Станоўчыя тэндэнцыі, лічыць ён, былі прадэманстраваны ў папярэдні час. Дарэчы, прамысловасць нашых суседзяў паказвае і таго больш сціплыя вынікі. Напрыклад, у Расіі за паўгоддзе тэмпы росту аб'ёмаў вытворчасці склалі 85,2 працэнта да студзеня-чэрвеня мінулага года, ва Украіне — 68,9.

Закранаючы пытанне занятасці, Віктар Міхно праінфармаваў, што ў студзені-маі ў цэлым па прамысловасці, акрамя суб'ектаў малога прадпрымальніцтва недзяржаўнай уласнасці, у параўнанні з гэтымі леташнімі месяцамі колькасць работнікаў, што былі пераведзены на працу з няпоўным працоўным тыднем, ці няпоўным працоўным днём па ініцыятыве наймальніка павялічылася ў 4,9 раза і склала 95 тысяч чалавек. А колькасць работнікаў, якім былі дадзены адпачынкі па ініцыятыве наймальніка, павялічылася ў 4,5 раза — 99,5 тысячы чалавек. Такім чынам на людзях адбіліся тыя ж праблемы з затаваранасцю складоў прадпрыемстваў і зніжэннем аб'ёмаў вытворчасці. Праўда, у маі, калі тэмпы прамысловай вытворчасці крыху павялічыліся — на 0,2 працэнта — у параўнанні з красавіком, колькасць работнікаў, якія працавалі няпоўны працоўны дзень ці тыдзень, зменшылася амаль на 16 працэнтаў і складала 47 тысяч чалавек.

Гаворачы пра фінансы прамысловых прадпрыемстваў, Віктар Міхно, у прыватнасці, прыгадаў, што іх выручка ад рэалізацыі тавараў, прадукцыі, работ і паслуг за пяць першых месяцаў склала 42,8 трыльёна рублёў, ці на 11,2 працэнта менш, чым за студзень-май 2008 года. Са стратамі ў прамысловасці працавалі 22,6 працэнта ад усіх арганізацый. Дарэчы, нягледзячы на вялікую колькасць апошніх, з пачатку года ўсё ж такі ідуць станоўчыя тэндэнцыі, таму што са стратамі працуе ўсё менш арганізацый. Так, на пачатку года, у студзені, у прамысловасці такіх было крыху больш за 30 працэнтаў, у студзені-лютым — 29,5, за студзень-сакавік — ужо 24,9, за студзень-красавік — 23,2.

**Ігар ШЧУЧЭНКА.**

# МОЖНА КУПАЦЦА Ў ДНЯПРЫ І БЯРЭЗІНЕ



Фота Марыі ЖЫЛІНСКАЙ.

**Жыхары Магілёва і Бабруйска маюць магчымасць атрымаць асалоду ад цёплага надвор'я і, нарэшце, купання ў прахалоднай рачной вадзе.**

Ад 16 ліпеня дазволена купанне ў рацэ Днепр на гарадскім пляжы ў Магілёве. Санітарныя службы горада ўводзілі забарону 8 ліпеня.

— На працягу купальнага сезона штотыдзень робіцца кантроль за якасцю вады на ўсіх пляжах, — патлумачыў **загадчык камунальнага аддзела Магілёўскага абласнога цэнтра гігіены, эпідэміялогіі і грамадскага здароўя Андрэй ІЛЫНІЧ.** — Калі пробы вады не адпавядаюць гігіенічным нормам, купанне забараняецца.

У вадзе была выяўлена вялікая колькасць кішэчнай палачкі. Гэта таксама датычылася двух пляжаў на рацэ Бярэзіна ў Бабруйску і аднаго — у Асіповіцкім раёне. Санітарныя ўрачы тлумачаць сітуацыю ўмовамі надвор'я: дажджы змываюць з палёў арганіку, а з берагоў — смецце. Калі ападкі працяглыя, то вада не паспявае самаачышчацца.

Аднак невялікага «сухога» тэрміну дастаткова, каб якасць вады палепшылася. Пробы вады ў Дняпры, узятыя на гэтым тыдні, па бактэрыяльных паказчыках адпавядаюць норме. Дазволена купанне і ў Бярэзіне ў Бабруйску: ад 10 ліпеня можна смела ісці ў ваду на пляжах на 6-м мікрараёне і каля санаторыя імя Леніна. А вось у Асіповіцкім раёне на вадасховішчы паблізу вёскі Вяззе аматарам купання давядзецца яшчэ пачакаць.

**Ілона ІВАНОВА.**

## Абзац



Фота БЕЛТА.

◢ Моцны лівень затапіў учора вуліцы Гродна. Па звестках метэаролагаў, за 6 дзённых гадзін выпала палова дэкаднай нормы ападкаў. У выніку моцна падтопленымі апынуліся многія вуліцы і дамы. Праз некалькі гадзін вада сышла, застаўшыся толькі ў падвалах. Выратавальнікам давялося некалькі разоў выязджаць па выкліках на адпампоўку вады.

◢ **Стрыечныя браты 5 і 6 гадоў патанулі ў Рэчыцкім раёне. Яны купаліся ў рэчцы Ведрыч без нагляду дарослых.**

◢ Былы ўчастковы інспектар Брэсцкага РАУС прыгавораны да 2 гадоў пазбаўлення волі за складанне фіктыўных пратаколаў. Старшы лейтэнант міліцыі 1983 г.н. у кастрычніку мінулага года сфальсіфікаваў пратаколы, акты аб канфіскацыі спіртазмяшчальных вадкасцяў у дачыненні да 4 жыхароў раёна. Ён сфабрыкаваў таксама тлумачэнні ад гэтых грамадзянаў, якія быццам бы пацвердзілі сваю віну ў дачыненні адміністрацыйных парушэнняў. Пакаранне ён будзе адбываць у калоніі агульнага рэжыму, яму забаронена займаць пэўныя пасады 5 гадоў.

## Поўны абзац

◢ **У Санкт-Пецярбургу нованароджанага хлопчыка назвалі Махмудахмадынеджадам — у гонар прэзідэнта Ірана. Хлопчык стаў шостым дзіцем у сям'і мусульманіна, які прыехаў у Расію з Бпангладэш, і мясцовай мусульманкі. Прозвішча сям'і не называецца. Улады не сталі пярэчыць бацькам, дзіця ўжо атрымала пасведчанне аб нараджэнні. Як расказала маці хлопчыка, ёй падабаецца прэзідэнт краіны, які не баіцца нічога, акрамя Алаха.**

◢ Педантычныя японцы, якія высока цэняць якасць абслугоўвання, пачынаюць вымяраць з дапамогай камп'ютара шырыню ўсмешкі сваіх супрацоўнікаў. Гэтую сістэму ўжо ўкараніла адна з чыгуначных кампаній: пры дапамозе спецыяльных сканераў, устаноўленых на 15 станцый Токіа, адбываецца «замер ветлівасці» працаўнікоў на працягу ўсёй працоўнай змены. Вынікі камп'ютарнага аналізу пакажуць, наколькі шырока і прыветліва японскі кантралёр усміхаўся пасажырам. Да тых, хто не вельмі стараўся, будуць прымяняцца пэўныя санкцыі. Гэтая ж сістэма будзе ўкаранёная ў хуткім часе і ў адной з бальніц горада Осака і ў месцы паркоўкі аўтамабіляў. Зусім верагодна, што хутка гэты метад возьмуць на ўзбраенне ў вялікіх гарадах краіны.

***Паводле паведамленняў карэспандэнтаў «Звязды» і інфармагенцтваў.***

## НАПАД НА ПРАДАЎШЧЫЦУ

У краму в. Тартакі, якая знаходзіцца за 25 км ад Баранавічаў, зайшоў невядомы і, выкарыстаўшы момант, калі там не было пакупнікоў, некалькі разоў ударыў цяжкім прадметам прадаўшчыцу па галаве.

Неўзабаве ў краму зазірнулі наведвальнікі і ўбачылі, што прадаўшчыца сядзіць на падлозе і крычыць. Яны выклікалі міліцыю. У выніку аператыўных дзеянняў удалося затрымаць у Слоніме жыхара Гродна. Пры ім была сякера, якую затрыманы ўкраў у леснікоў. Сякерай ён і біў прадаўшчыцу. А ў краме ён украў батон каўбасы, бутэльку вады, хлеб ды 200 тыс. рублёў. Прадаўшчыца ў цяжкім стане знаходзіцца ў бальніцы, а следчыя працуюць з затрыманым.

**Сымон СВІСТУНОВІЧ.**

А не шкодзь!

## Падпаляўнічага затрымалі ў заказніку

**Жыхар Мінска наладзіў незаконнае падводнае паляванне на самым глыбокім возеры Беларусі — Доўгім.**

Доўгае, што ў Глыбоцкім раёне, з'яўляецца гідралагічным заказнікам рэспубліканскага значэння і там, натуральна, забароненыя інтэнсіўныя спосабы лоўлі рыбы, да якіх адносіцца і падпаляванне. Браканьер з дапамогай гідракасцюма і стрэльбы для падводнага палявання паспеў падстрэліць усяго толькі аднаго шчупака ды і тое недамерка, калі яго спынілі работнікі Глыбоцкай міжраённай інспекцыі аховы жывёльнага і расліннага свету. Па рашэнні суда недысцыплінаваны падпаляўнічы можа пазбавіцца гідракасцюма і ўсёй экіпіроўкі.

Як паведаміў «Звяздзе» **начальнік Глыбоцкай міжрайінспекцыі Аляксей ПРОТАС,** літаральна днямі давялося затрымліваць і браканьераў з агнястрэльнай зброяй. Падчас прыродаахоўнага рэйду сумесна з супрацоўнікамі Глыбоцкага аддзялення Беларускага таварыства паляўнічых і рыбаловаў у паляўнічых угоддзях Полацкай леса-паляўнічай гаспадаркі былі затрыманы два жыхары Полацка. Парушальнікі ажыццяўлялі паляванне без дазваляльных дакументаў як на права палявання, так і на права нашэння і захоўвання зброі. Канфіскаваны дзве паляўнічыя стрэльбы. Браканьераў чакае суд.

**Сяргей АЛЯКСАНДРАЎ.**

Пенсіі

# «ПРАПОРЦЫІ» З ПОПЫТАМ

**Да канца года Беларусь і Расія павінны падрыхтаваць узгоднены варыянт адміністрацыйнага пагаднення, якое будзе рэгламентаваць усе пытанні прызначэння пенсій у выпадку пераезду грамадзян з адной краіны ў другую. Пры гэтым, як адзначыла ў гутарцы з карэспандэнтам «Звязды» намеснік начальніка галоўнага ўпраўлення пенсійнага забеспячэння і сацыяльнага страхавання Міністэрства працы і сацыяльнай абароны Ларыса ЯШКОВА, чакаецца, што пасля прыняцця гэтага дакумента будзе вырашаны шэраг праблемных пытанняў, што з'явіліся пасля падпісання дагавора аб супрацоўніцтве ў галіне сацыяльнага забеспячэння.**

Варта нагадаць, што ў выпадку пераезду ў межах СНД дзейнічае так званы тэрытарыяльны прынцып — пенсія прызначаецца той краінай, дзе пенсіянер пражывае цяпер. Такі ж варыянт магчымы і ў дачыненні да Расіі. Праўда, у гэтым выпадку ён не адзіны. Пры пераездзе з Беларусі і ў Расійскую Федэрацыю ці наадварот пенсія за «савецкі» стаж зноў-такі прызначаецца паводле тэрытарыяльнага прынцыпу. А вось у дачыненні да працы пасля 13 сакавіка 1992 года, па жаданні самога пенсіянера, можа дзейнічаць прынцып «прапорцый» — паводле гэтага прынцыпу, кожная з дзвюх дзяржаў прызначае і выплачвае пенсію за стаж, зароблены на яе тэрыторыі.

— Прапарцыянальны прынцып прызначэння пенсій за «постсавецкую» працу сапраўды стаў папулярным, пры пераездзе з Расіі ў Беларусь ці наадварот гэтаму варыянту аддае перавагу большасць, — адзначае Ларыса Яшкова. — Па-першае, у выпадку «падзелу стажу» на беларускую і расійскую часткі пенсіі прызначаюцца паводле нацыянальнага заканадаўства кожнай з краін — гэта дазваляе пазбегнуць многіх спрэчных момантаў, і ў тым ліку адносна прадастаўлення тых або іншых пенсійных ільгот. А, па-другое, варта звярнуць увагу: у выпадку прызначэння пенсій паводле прапарцыянальнага прынцыпу чалавек мае права змяніць сваё рашэнне і выбраць іншы варыянт — атрымліваць пенсію паводле заканадаўства той краіны, грамадзянінам якой ён з'яўляецца. У той жа час перайсці з прынцыпу «грамадзянства» на прынцып «прапорцый» ужо нельга.

Пры гэтым у міністэрстве адзначаюць: каб аформіць расійскую частку пенсіі ў Беларусі ці беларускую частку пенсіі ў Расіі, чалавеку не трэба шукаць дакументы аб стажы і заробках самастойна. Дастаткова звярнуцца ў органы па прызначэнні пенсій на тэрыторыі краіны цяперашняга пражывання.

Не ўзнікае цяпер пытанняў і з пералічэннем пенсій з адной дзяржавы ў другую. Пакуль застаецца па сутнасці толькі адна праблема — дастаткова вялікі час прызначэння пенсій у выпадку іх падзелу на прапорцыі.

— Калі чалавек хоча атрымліваць расійскую частку пенсіі за працу на тэрыторыі суседняй краіны пасля 13 сакавіка 1992 года, ён падае заяву ў Беларусі, — кажа Ларыса Яшкова. — Потым нашы службы фарміруюць неабходны пакет дакументаў і накіроўваюць яго ў Пенсійны фонд у Маскву. У сваю чаргу Пенсійны фонд высылае дакументы ў рэгіёны — па месцы ранейшай працы.

Далей расійскі рэгіён прызначае пенсію і накіроўвае інфармацыю ў Маскву. А ў сваю чаргу Масква займаецца выплатай — пералічэннем пенсіі ў Беларусь. У выніку тэрмін ад падачы заявы да выплаты пенсіі можа складаць 2-3 месяцы. Разам з тым, у міністэрстве разлічваюць вырашыць некаторыя праблемныя моманты праз двухбаковае адміністрацыйнае пагадненне. Гэтым пагадненнем плануецца ўрэгуляваць тэхнічныя нюансы — куды падаецца заява, як яна разглядаецца і які канкрэтна час, тэхналогіі пераводу пенсій. Работа над дакументам ужо вядзецца, прычым чакаецца, што яна закончыцца сёлета. Між тым, нагадала Ларыса Яшкова, прапарцыянальны прынцып прызначэння пенсій дзейнічае ў адносінах з яшчэ адной краінай — Літвой. Тут у параўнанні з расійскім варыянтам існуе толькі адно адрозненне — пенсія за «савецкі» стаж прызначаецца краінай пражывання і не змяняецца ў выпадку пераезду.

— Аналагічны дагавор летась быў заключаны і з Латвіяй, — адзначае Ларыса Яшкова. — Аднак з самых розных прычын дагэтуль мы не змаглі падпісаць тыя ж адміністрацыйныя і тэхнічнае пагадненні, якія павінны ўрэгуляваць усе працэдурныя нюансы. Адпаведна, пакуль дагавор з гэтай краінай Балтыі не дзейнічае. Зрэшты, самі тэксты пагадненняў ужо распрацаваныя, і мы спадзяёмся, што латвійскі бок разгледзіць гэтыя дакументы ў найбліжэйшы час.

**Сяргей ГРЫБ.**

# ХРОНІКА АПОШНІХ ПАДЗЕЙ

## СПЕЦСЛУЖБЫ ЛАТВІІ ПРАГНАЗУЮЦЬ САЦЫЯЛЬНЫ ВЫБУХ І ХОЧУЦЬ ПАЎНАМОЦТВАЎ



**Супрацоўнікі спецслужбаў Латвіі просяць пашырыць іх паўнамоцтва. Яны ўпэўненыя, што з-за эканамічнай і сацыяльнай сітуацыі, якая пастаянна пагаршаецца, у краіне пачнуцца выступленні насельніцтва, перадае сайт Тэлеграф.lv.**

Супрацоўнікі Паліцыі бяспекі МУС Латвіі накіравалі ва ўрад папраўкі да закона аб спецслужбах. Паводле прапанаваных змяненняў, частка паліцэйскіх атрымлівае права апытваць, выклікаць на гутарку і атрымліваць тлумачэнні ў любога жыхара Латвіі, калі ў стаўленні да яго ўзніклі падазрэнні. Паводле інфармацыі выдання, у праекце таксама прапаноўваецца надзяліць супрацоўнікаў спецслужбаў правам папярэджваць патэнцыйнага бунтаўніка аб тым, што ён займаецца супрацьпраўнай дзейнасцю і можа панесці за гэта адказнасць. Паводле меркавання кіраўніцтва спецслужбаў, пашырэнне іх паўнамоцтваў дапаможа патушыць сацыяльны пажар. Як адзначае Тэлеграф.lv, гэтыя прапановы выклікаюць пытанні з пункту гледжання правоў чалавека. Латвія вельмі цяжка перажывае эканамічны крызіс. ВУП краіны ў І квартале 2009 года ўпаў на 18 %.

## THE TIMES: ЗАХАД ГАТОВЫ ЎХВАЛІЦЬ НАПАД ІЗРАІЛЯ НА ІРАН НА ПРАЦЯГУ ГОДА



**Заходнія дыпламаты цяпер схільныя ўхваліць ізраільскі ўдар па Іране. Пра гэта са спасылкай на нейкага брытанскага чыноўніка піша The Times.**

Разменнай манетай у гэтым пытанні можа стаць супрацоўніцтва Тэль-Авіва ў справе стварэння палесцінскай дзяржавы, лічаць журналісты. Адзначым, што мірнае ўрэгуляванне блізкаўсходняга канфлікту абмяркоўвалася, у прыватнасці, на нядаўнім саміце G8. Усё гэта значыць, што ваенная аперацыя Ізраіля супраць Ірана можа адбыцца «на працягу года», піша газета.

## АБАМУ ПАПРАСІЛІ АБАРАНІЦЬ ЕЎРОПУ АД РАСІІ



**Палітыкі з еўрапейскіх краін звярнуліся да прэзідэнта ЗША Барака Абамы з адкрытым лістом, у якім папрасілі НАТА надаць больш увагі бяспецы ў рэгіёне і супрацьстаяць «нарастаючаму запалохванню» з боку Расіі.**

Пад апублікаваным 16 ліпеня лістом падпісаліся Валдыс Адамкус, Лех Валенса, Вацлаў Гавел, Аляксандр Квасьнеўскі, Вайра Віцы-Фрэйберга і іншыя палітыкі. Аўтары ліста заяўляюць, што вітаюць «перазагрузку» расійска-амерыканскіх адносінаў, але раяць ЗША прытрымлівацца больш пэўнай і прынцыповай пазіцыі па стаўленні да Масквы. Паводле меркавання еўрапейскіх палітыкаў, якія спасылаюцца на ўласны вопыт узаемаадносінаў з Расіяй, гэта «не толькі ўзмоцніць сістэму бяспекі Захаду, але і падштурхне Маскву да супрацоўніцтва».

У лісце надаецца ўвага пытанню размяшчэння амерыканскіх ПРА ў Еўропе. «Невялікая колькасць ракет не можа пагражаць інтарэсам Расіі, і ў Крамлі гэта разумеюць», — гаворыцца ў пасланні. У сувязі з гэтым палітыкі просяць ЗША ў большай ступені прыслухоўвацца да меркавання лідараў Польшчы і Чэхіі і не дапускаць празмернага ўмяшання Масквы ў пытанне ядзернай абароны Еўропы. У адваротным выпадку, паводле меркавання аўтараў, давер да ЗША ва Усходняй і Цэнтральнай Еўропе можа знізіцца.

## ЖОНКА ЭКС-ПРЭМ'ЕРА БРЫТАНІІ ТОНІ БЛЭРА, МАГЧЫМА, ПАДХАПІЛА СВІНЫ ГРЫП

Жонка экс-прэм'ера Вялікабрытаніі Тоні Блэра Шэры, магчыма, захварэла на грып A/H1N1 («свіны грып»). Як паведамляецца, Шэры, займаючыся прафесійнай юрыдычнай дзейнасцю пад дзявочым прозвішчам Бут, з-за нядужання з падазрэннем на грып A/H1N1 у чацвер адмяніла свой удзел ва ўрачыстай цырымоніі ва ўніверсітэце яе роднага Ліверпуля.



**Минский районный исполнительный комитет *18 августа 2009 г.* проводит открытый *аукцион* на право заключения договоров аренды земельных участков в Минском районе**

| | | Лот 1 | Лот 2 | Лот 3 | Лот 4 | Лот 5 | Лот 6 | Лот 7 | Лот 8 | Лот 9 |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| 1 | Адрес земельного участка | Минский район, Хатежинский с/с, район деревень Хатежино – Новая Веска | Минский район, район деревень Дегтяревка, Таборы | Минский район, Сеницкий с/с, район д. Колядичи | Минский район, Новодворский с/с, 16 км МКАД | Минский район, Новодворский с/с, вблизи автодороги М-4 Минск—Могилев на 14 км (право) | Минский район, Мачулищанский с/с, г.п. Мачулищи | Минский район, Колодищанский с/с, п. Колодищи | Минский район, Ждановичский с/с, п. Ратомка | Минский район, Острошицко-Городокский с/с, д. Крестиново |
| 2 | Кадастровый номер | 623687500001000100 | 623681700001000357 | 623686600001000205 | 623600000001000154 | 623684300001000329 | 623655500001000303 | 623683403101005890 | 623681708601002213 | 623685203601000 |
| 3 | Площадь земельного участка | 14,9999 га | 30,0012 га | 1,4555 га | 10,0000 га | 10,0000 га | 0,5004 га | 0,1006 га | 0,8501 га | 4,0668 га |
| 4 | Срок аренды (лет) | 51 | 51 | 51 | 49 | 49 | 51 | 30 | 40 | 5 |
| 5 | Целевое назначение | Для строительства логистического центра | Для строительства логистического центра с комплексом складских сооружений | Для строительства автомобильной стоянки | Для строительства гипермаркета с многофункциональной направленностью | Для строительства гипермаркета с многофункциональной направленностью | Для строительства производственно-складских и технических сооружений для производства изделий медицинского назначения | Для строительства кафе-магазина | Для строительства физкультурно-оздоровительного комплекса | Для строительства комплекса малоэтажной жилой застройки с созданием инженерно-технической инфраструктуры и объектами соцкультбыта |
| 6 | Сумма убытков и потерь с/х производства (рублей) | 1 863 552 538 | 3 179 682 753 | 25 275 860 | 1 435 368 165 | 1 014 340 173 | 8 487 405 | 3 720 209 | - | - |
| 7 | Расходы по подготовке документации (рублей) | 6 449 085 | 4 006 284 | 1 519 992 | 4 061 088 | 3 623 656 | 1 827 820 | 1 114 223 | 2 151 045 | 723 948 |
| 8 | Начальная цена права заключения договора аренды | 359 028,60 долларов США | 718 090,71 долларов США | 155 993,66 долларов США | 1 052 744 долларов США | 1 052 744 долларов США | 35 851,36 долларов США | 20 619,98 долларов США | 33 676,20 долларов США | 15 938 600 белорусских рублей |
| 9 | Задаток (рублей) | 60 000 000 | 120 000 000 | 26 000 000 | 180 000 000 | 180 000 000 | 10 150 000 | 5 840 000 | 9 540 000 | 1 500 000 |

Аукцион состоится по адресу: г. Минск, ул. Ольшевского, д. 8, к. 307. Дата проведения: **18.08.2009 г. в 14:00**

Заявления на участие и необходимые документы принимаются с 20.06.2009 г. с 9:00 до 16:00 по адресу: г. Минск, ул. Ольшевского д.8, к. 416. Окончание приема заявлений и документов 13.08.2009 г. в 13:00. Контактный телефон (8-025) 92-761-92.

Задаток перечисляется на р\с 3641200070048 в Октябрьское отд. в г. Минске ОАО «Белинвестбанк», г. Минск, код 737, УНП 600068187, получатель Минский районный исполнительный комитет.

К участию в аукционе допускаются лица, подавшие в комиссию в указанные сроки соответствующее заявление с приложением необходимых документов и внесшие в установленном порядке на указанный в объявлении расчетный счет задаток.

Победитель аукциона обязан в течение 10 (десяти) рабочих дней со дня принятия решения о предоставлении ему земельного участка внести плату за право заключения договора аренды земельного участка, возместить потери сельскохозяйственного производства, вызванные изъятием сельскохозяйственных земель для использования в целях, не связанных с ведением сельского хозяйства, и расходы, оговоренные в условиях проведения аукциона. Договор аренды земельного участка заключается с победителем в течение 2-х рабочих дней после внесения им всех причитающихся платежей.

Все желающие могут ознакомиться с документацией и земельными участками.

Аукцион признается не состоявшимся в случаях если: заявление об участии в аукционе подано менее чем двумя участниками; ни один из участников аукциона после трехкратного объявления первой объявленной цены не поднял аукционный номер; ни один из участников аукциона в соответствии с решением комиссии не был признан победителем.

Документы, необходимые для участия в аукционе на право заключения договоров аренды земельных участков:

1. Заявление на участие в аукционе с указанием кадастровых номеров и адресов земельных участков.

2. Заверенные банком копии платежных поручений о внесении задатка на расчетный счет.

Кроме того, в комиссию представляются:

- гражданином - копия документа, содержащего его идентификационные сведения без нотариального засвидетельствования;
- индивидуальным предпринимателем - копия свидетельства о государственной регистрации индивидуального предпринимателя без нотариального засвидетельствования;
- представителем гражданина или индивидуального предпринимателя - нотариально удостоверенная доверенность;
- представителем или уполномоченным должностным лицом юридического лица Республики Беларусь - доверенность, выданная юридическим лицом, или документ, подтверждающий полномочия должностного лица, копии устава и свидетельства о государственной регистрации юридического лица без нотариального засвидетельствования, документ с указанием банковских реквизитов юридического лица;
- представителем или уполномоченным должностным лицом иностранного юридического лица - легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть произведена в течение года до подачи заявления на участие в аукционе) либо иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны происхождения с засвидетельствованным в установленном порядке переводом на белорусский или русский язык, легализованные в установленном порядке доверенность или документ, подтверждающий полномочия должностного лица, документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, с засвидетельствованным в установленном порядке переводом на белорусский или русский язык;
- представителем иностранного гражданина - легализованная в установленном порядке доверенность, документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, с засвидетельствованным в установленном порядке переводом на белорусский или русский язык.

При подаче документов на участие в аукционе граждане, представители граждан, индивидуальных предпринимателей и юридических лиц, уполномоченные должностные лица юридических лиц предъявляют документ, удостоверяющий личность.

# ДЗІЦЯЧАЯ ЭКСПЕРТЫЗА

## Неразгаданая дзіцячая загадка «базару»


Маша

**Хто пераможа: самы маленькі па росце або па ўзросце? — усё гадалі пасля конкурсных выступленняў юных талентаў гледачы і рэпарцёры.**

Учора бліжэй да чацвёртай гадзіны дня на «базары» сталі вядомыя пераможцы Міжнароднага дзіцячага музычнага конкурсу «Віцебск - 2009». За перамогу змагаліся 19 удзельнікаў з 16 краін свету. По добрай традыцыі журы конкурсу юных выканаўцаў на «базары» пасля кожнага конкурснага дня (а ўсяго, нагадаю, іх два) публічна не выстаўляюць ацэнкі. Вось і думай!

У першы дзень юныя таленты выконвалі песню на нацыянальнай мове. На другі — на свой выбар. Я з маім памочнікам і дзіцячым экспертам ад равеснікаў - гледачоў старэйшым сынам маім Мішам таксама меркавалі: хто самы рэальны кандыдат на перамогу? Натуральна, як патрыёты мы хварэлі за нашых Машу — самую юную, 7-гадовую ўдзельніцу, і за Лаліту. Маша вельмі спадабалася публіцы ў першы конкурсны дзень — заўзятая такая, энергічная, шчырая.

11-гадовая Лаліта ўжо спрактыкаваная канкурсантка, лаўрэат і дыпламант некалькіх конкурсаў, у тым ліку і за мяжой, таксама пакінула самыя прыемныя ўражанні.

Але 11-гадовы канкурсант з Украіны Андранік Алексанян — самы маленькі па росце — такі моцны канкурэнт. Чулі б вы, як ён праспяваў на другі дзень конкурса на ўкраінскай мове «Я кахаю толькі цябе»! Доўга гучалі апладысменты ў ягоны адрас. Так доўга, што ён выйшаў па просьбе вядучых на сцэну зноў. Да ведама: сёлета ён перамог у нацыянальным адборачным дзіцячым туры «Еўрабачання», а гэта, пагадзіцеся, высокі ўзровень...

А 10-гадовы Шохрух Юнусаў з Таджыкістана (гэтая краіна ўпершыню ўдзельнічае ў дзіцячым конкурсе) настолькі ўпэўнена трымаўся на сцэне, што і сумненняў няма — адназначна можа заняць прызавое месца. Але якое? У другі дзень ён, як кажуць, «чыста» выканаў песню «Лодка».

А як прыгожа спявала знакамітую песню Каруза прадстаўніца Італіі Верджылія Сідзі... А дзевяцігадовая «прынцэса» з Румыніі Марыя — лаўрэат некалькіх прэмій. Годны супернік нашых дзяўчатак.

Каб усё-такі раней выведаць пра балы за два дня, мы з маім юным экспертам і калегам адразу пасля завяршэння другога конкурснага туру нават спрабавалі «выйсці на кантакт» са старшынёй журы народным артыстам Беларусі Леанідам Захлеўным. Ды не атрымалася... Цікава, што «старшыня» журы пасля першага конкурснага дня прызнаўся, што нікому з удзельнікаў не паставіў ацэнку, ніжэйшую за «8». Значыць ніхто тады яго асабіста «не расчараваў»? Зноў інтрыга.

На момант падрыхтоўкі гэтага артыкула мы з экспертам усё «галаву ламалі» — хто ж атрымае Гран-пры? І, узнагароджаны 5 тысячамі долараў, зможа да таго ж выступіць у канцэрце закрыцця «базару» на яго галоўнай сцэне — у Летнім амфітэатры.

**Аляксандр ПУКШАНСКІ. Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.**


Лаліта

Дзённік фестывалю

# АД ЦВІКА ДА ДЫВАНА

**Нават не ведаючы Віцебска, немагчыма прамахнуцца міма Горада майстроў, які штогод робіцца неад'емнай часткай «Славянскага базару». Бо сюды, у гарадскі цэнтр рамёстваў «Задзвінне» на былых саляных складах, няспынна цякуць не тое што ручайкі — рэкі людскія, святочныя і яркія.**

Дый паглядзець ёсць на што. Калі пажылых людзей прываблівають салодкія пахі ад латкоў, што гандлююць мёдам — грэцкім, ліпавым, рэдкім кедравым, лугавым, кветкавым — аж слінка набягае, то моладзь ахвотна ідзе на звон мячоў і гукі сярэднявечных інструментаў да пляцоўкі, дзе адбываюцца рыцарскія баі і танцавальныя пастаноўкі. Мамы з дзецьмі спыняюцца ля стэндаў з глінянымі свістулькамі і забаўнымі фігуркамі, модніцы-дзяўчаты навобмацак



ацэньваюць рознакаляровыя льняныя сарафаны, сукенкі і спадніцы, мужчыны захоплена прышчоўкваюць языкамі, гледзячы на тонкай работы вырабы кавалёў, да майстроў ганчарнай і ткацкай справы ўвогуле стаяць чэргі ахвотных узяць майстар-клас. Карацей, тут пры жаданні можна знайсці ўсё — і плашч, і цвік для таго, каб павесіць плашч, і нават самаробны штыкетнік, куды ўбіць той цвік. І хоць пэўная частка прапанаваных у Горадзе майстроў вырабаў створана рукамі працалюбівых кітайцаў — куды без іх — усё ж наведнікі беспамылкова знаходзяць сярод рынкавага шырспажыву творы беларускіх народных майстроў.

— Гэтыя фарбы не выцвітаюць і не змываюцца, захоўваюцца дзесяцігоддзямі, — расказвае зацікаўленым удзельніца конкурсу маляваных дываноў Лілія Каваленка з Віцебска, паказваючы свае работы — роспісы на чорных і цёмна-зялёных тканых палотнах. — Бо грунтоўку мы робім правільную, па рэцэптах нашых продкаў, карыстаючыся ўзорамі, якія пакінуў у спадчыну наш знакаміты мастак Язэп Драздовіч. І хоць па ўмовах конкурсу нам адводзілася ўсяго два дні для роспісу дываноў, але ўсе рабілі гэта на такім уздыме! І паглядзіце — сярод удзельнікаў хапае маладых педагогаў з абласных і раённых цэнтраў рамёстваў, у іх таксама свае вучні, таму гэта мастацтва ў нас не знікае, адраджаецца. Яно не памерла дагэтуль — не памрэ і цяпер.

Шчыльнае кола гледачоў сабралася і вакол ткацкага станка, за якім сядзіць Марына Гушча з Гарадка. У яе на кроснах — як быццам звычайны рушнік... ды не зусім звычайны, ажурнага пляцення. «Я ўжо гадоў 17 займаюся ткацтвам, і асабліва падабаецца менавіта гэты кірунак — ажурнае ткацтва, наш раён славіцца якраз гэтымі вырабамі, — тлумачыць



Марына, не перапыняючы работы. — Пачынала з дробных габеленаў, а потым захапілася, і мужа захапіла — ён у мяне спецыяліст па разьбе, гэта ён станок зрабіў невялічкі перасоўны, які можна не разбіраць бясконца, а перавозіць у рабочым выглядзе. Цяпер раблю ажурны рушнік — бачыце, якая нітка тонкая, работа патрабуе ўвагі і цярпення, пяшчоты нават, бо твой настрой перадаецца вырабу. Таму і ў вучні я бяру не дзяцей, а ўжо дарослых дзяўчат, якім цікавыя традыцыі ткацтва і якія гатовыя да доўгай, цярплівай работы. Ад сябе нічога не прыдумляю, аднаўляю гарадоцкія традыцыі, хіба што ніткі сучасныя выкарыстоўваю». Некалькі гадоў таму, узгадвае Марына, яе работа перамагла тут жа, на «Славянскім базары ў Віцебску», у конкурсе ткачоў. Але цяпер прыехала не па прызы, а хутчэй, па вопыт — свой перадаць, у іншых павучыцца.

Каваль з Ліды Генадзь Савонь вызначаецца не толькі схільнасцю да гігантаманіі — яго за цвікі і падковы памеру XXXL заўсёднікі ўжо назвалі «ляўша навыварат», але таксама адметным пачуццём гумару. Вось у дэкаратыўным пні тырчыць жалезны прут вышынёй метра ў 1,5 — гэта, аказваецца, «апошні цвік, каб забіць на ўсё» (малаток у камплекце). А побач стаіць на хвасце, разявіўшы пастку, металічная кобра. З подпісам: «Партрэт мамы, калі тата не даў ёй грошай». Хлопцы рагочуць. Дзяўчаты абураюцца.

— Ведаеце, што мне сказала жонка, убачыўшы гэту работу? — супакойвае іх майстар. — Зрабіць другую такую ж, з подпісам «Тата, калі мама сказала, што абеду сёння не будзе, бо грошай у яе няма».

Дарэчы, калі Горад майстроў наведаў дзяржсакратар Саюзнай дзяржавы Павел Барадзін, ён таксама спыніўся ля работ Генадзя. І атрымаў ад майстра адмысловы падарунак — «антыкрызісную валюту», манеткі, аздобленыя пад даўніну. «Калі крызіс пераажыць не дапамогуць, то хоць настрой узрымуць», — перакананы майстар.

Уласна, у тым ліку і дзеля гэтага госці і ўдзельнікі фестывалю зазіраюць у Горад майстроў — бо выходзяць калі і без адмысловых сувеніраў, то дакладна з добрым настроем.

**Вікторыя ЦЕЛЯШУК. Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.**



*Сардэчна віншуем з 80-годдзем Галіну Уласаўну ДАМАСЕВІЧ з вёскі Галынь Навагрудскага раёна. Няхай будзе заўсёды здароўе і моц, жыццё будзе доўгім і шчаслівым.*

**Суседкі з вёскі Галынь.**

# Самыя дэфіцытныя білеты

**Як вы думаеце, якія самыя дэфіцытныя білеты заўсёды на «базары»? І сёлета таксама? І будуць у наступным годзе? Думаеце, што на адкрыццё, закрыццё фестывалю? Зусім не! Самыя пажаданыя білеты — на тэатральныя пастаноўкі. І каб купіць білеты на добрыя месцы, трэба ведаць якім чынам, праз каго. Гэта пастараўся высветліць рэпарцёр «Звязды».**

Ужо ў самы першы дзень продажу за імі выстройваюцца чэргі. Наконт так званых перакупшчыкаў як старажыл «базару» магу адзначыць — няма ў правінцыйным горадзе, у адрозненне ад сталіцы, такога «руху». Не бачыў ніколі, каб перад пачаткам спектакляў хлопцы падыходзілі б і прапаноўвалі купіць білеты.

На першы погляд усё так проста — прыйшоў да афіцыйных касаў «базару», пастаяў ў чарзе, купіў. Але ж не. Ужо літаральна пад вечар у першы дзень продажу, тым больш на другі дзень «базару», добрых білетаў у тэатр не адшукаць — праверана асабіста.

Таму аматары тэатра раптам пачынаюць узгадваць, хто ў іх са сваякоў працуе «бліжэй да базару». Усе мы разумеем: сваім білеты знойдуцца. Ды і ў распаўсюджвальнікаў білетаў у тэатр яны заўсёды ёсць, калі, вядома ж, вы кагосьці з іх асабіста ведаеце. Часова падпрацоўваюць такім чынам людзі «ад культуры».

Вельмі актыўна прадаюць білеты на тэатральныя пастаноўкі па так званых калектыўных заяўках. Калі вы не працуеце ў канкрэтнай арганізацыі, заказаць білеты для вас можа і сваяк, які там працуе.

Таямніца за «замкамі» — хто мае права атрымаць запрашальныя білеты. Між іншым, штогод іх колькасць скарачаецца.

Каб трохі паменшыць дэфіцыт білетаў, ужо некалькі гадоў тэатральныя пастаноўкі паказваюць у канцэртнай зале «Віцебск», дзе ў параўнанні з залай «коласаўскага» тэатра месцаў у разы больш. Але і гэта не вырашыла праблему.

Сёлета на «базары» масквічы паказвалі «Майстра і Маргарыту», латышы — музычны спектакль пра Адэсу часоў Бабеля. Учора пры поўнай зале паказалі спектакль тэатра Эмануіла Вітаргана «Трыа».

**Аляксандр ПУКШАНСКІ.**

## МЕДЫКІ З «ХУТКІХ» ПАСТАВІЛІ РЭКОРД

**На «базары» ў гэтым годзе ў цэнтры фестывальных падзей у «зоне бяспекі» ля Летняга амфітэатра дзяжурыла рэкордная колькасць машын «хуткай дапамогі» — ажно 20. Для параўнання, летась іх было толькі 12. А гадоў дзесяць таму ўсяго 2 — 3 машыны. Каб паставіць своеасаблівы «базарны» рэкорд з «хуткім» ухілам, віцебскім брыгадам на дапамогу прыязджалі калегі з Оршы, Наваполацка.**

Як адзначаюць «хуткія» медыкі, асабліва шмат работы ім не было. Колькасць выклікаў у Віцебску ў цэлым не павялічылася.

Дарэчы, наконт парадку ў горадзе. Ва УУС Віцебскага аблвыканкама адзначылі, што «базар» прайшоў спакойна, як ніколі. А ўсё таму, што вельмі пільна сачылі за парадкам.

**Аляксандр ПУКШАНСКІ.**

## ЗАО «Дельта Банк»

*220036, г. Минск, ул. Розы Люксембург, 95. Тел. 279 0 279*
*www.deltabank.by*

### БУХГАЛТЕРСКИЙ БАЛАНС на 1 июля 2009 г.

*(в миллионах белорусских рублей)*

| № п/п | Наименование статьи | Символ | 01.07.2009 | 01.07.2008 |
|---|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 |
| 1 | АКТИВЫ | | | |
| 2 | Денежные средства | 1101 | 4 502,8 | - |
| 3 | Средства в Национальном банке | 1102 | 2 302,8 | 4 581,9 |
| 4 | Ценные бумаги: | 1103 | - | - |
| | для торговли | 11031 | - | - |
| | удерживаемые до погашения | 11032 | - | - |
| | в наличии для продажи | 11033 | - | - |
| 5 | Кредиты и другие средства в банках | 1105 | 48 452,2 | 25 007,6 |
| 6 | Кредиты клиентам | 1106 | 61 965,3 | 55 258,0 |
| 7 | Долгосрочные финансовые вложения | 1107 | 703,4 | 551,4 |
| 8 | Основные средства и нематериальные активы | 1108 | 9 855,6 | 9 652,4 |
| 9 | Прочие активы | 1109 | 5 292,6 | 3 907,9 |
| 10 | ИТОГО активы | 110 | 133 074,7 | 98 959,2 |
| 11 | ОБЯЗАТЕЛЬСТВА | | | |
| 12 | Средства Национального банка | 1202 | - | - |
| 13 | Кредиты и другие средства банков | 1205 | 28 577,8 | 19 161,9 |
| 14 | Средства клиентов | 1206 | 37 154,1 | 9 089,3 |
| 15 | Ценные бумаги, выпущенные банком | 1208 | 160,6 | - |
| 16 | Прочие обязательства | 1209 | 1 692,1 | 6 201,2 |
| 17 | ВСЕГО обязательства | 120 | 67 584,6 | 34 452,4 |
| 18 | КАПИТАЛ | | | |
| 19 | Уставный фонд | 1211 | 64 000,0 | 64 000,0 |
| 20 | Эмиссионный доход | 1212 | - | - |
| 21 | Резервный фонд | 1213 | 513,8 | 260,0 |
| 22 | Накопленная прибыль | 1214 | 815,5 | 86,0 |
| 23 | Фонд переоценки статей баланса | 1215 | 160,8 | 160,8 |
| 24 | ВСЕГО капитал | 121 | 65 490,1 | 64 506,8 |
| 25 | ИТОГО обязательства и капитал | 12 | 133 074,7 | 98 959,2 |
| 26 | ТРЕБОВАНИЯ И ОБЯЗАТЕЛЬСТВА НА ВНЕБАЛАНСОВЫХ СЧЕТАХ | | | |
| 27 | Требования | 1301 | 55 879,8 | 6 375,8 |
| 28 | Обязательства | 1302 | 49 391,8 | 42 485,1 |

### ОТЧЕТ О ПРИБЫЛИ И УБЫТКАХ на 1 июля 2009 г.

*(в миллионах белорусских рублей)*

| № п/п | Наименование статьи | Символ | 01.07.2009 | 01.07.2008 |
|---|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 |
| 1 | Процентные доходы | 2011 | 5 577,9 | 1 874,3 |
| 2 | Процентные расходы | 2012 | 2 112,9 | 239,1 |
| 3 | Чистые процентные доходы | 201 | 3 465,0 | 1 635,2 |
| 4 | Комиссионные доходы | 2021 | 13 836,5 | 6 111,3 |
| 5 | Комиссионные расходы | 2022 | 209,1 | 57,4 |
| 6 | Чистые комиссионные доходы | 202 | 13 627,4 | 6 053,9 |
| 7 | Чистый доход по операциям с иностранной валютой | 203 | (-435,3) | 1 823,2 |
| 8 | Чистый доход по операциям с ценными бумагами | 204 | - | - |
| 9 | Доход в форме дивидендов | 205 | - | - |
| 10 | Чистые отчисления в резервы | 206 | 715,0 | 109,1 |
| 11 | Прочие доходы | 207 | 4 340,4 | 3 635,8 |
| 12 | Операционные расходы | 208 | 17 364,3 | 12 879,5 |
| 13 | Прочие расходы | 209 | 1 815,5 | 95,1 |
| 14 | Налог на прибыль | 210 | 287,2 | 6,1 |
| 15 | ПРИБЫЛЬ (УБЫТОК) | 2 | 815,5 | 58,3 |

Председатель Правления — И.С. Партнова
Главный бухгалтер — С.И. Миркевич

*Лицензия НБ РБ на осуществление банковской деятельности № 27 от 01.09.2007 г. УНП 807000015*

Інфарм-укол

# Навошта патрэбны БАДы?

Першае, што варта мець на ўвазе: БАДы — не лекі і не прадукт харчавання. Яны заклікаы прафілактаваць, папярэджваць захворванні або дапамагаць лячэбнаму працэсу. Абавязковым патрабаваннем да БАДаў з'яўляецца адсутнасць пабочных эфектаў. Тым не менш апошніх можна не пазбегнуць, калі прызначаць сабе дабаўкі самастойна. Рэкамендаваць БАДы павінны ўрачы: спецыяліст куды лепей за распаўсюджвальніка ці аптэкара ведае, што і ў якой колькасці вам неабходна прымаць.

БАДы наогул дзеляцца на дзве групы: нутрыцэўтыкі і парафармацэўтыкі. Першыя ўтрымліваюць вітаміны, мінералы, амінакіслоты, фосфаліпіды, антыаксіданты, харчовыя валокны і іншыя кампаненты, прызначаныя для карэкцыі нерацыянальнага, незбалансаванага харчавання. Другія ж прызначаны для павышэння адаптацыйных магчымасцяў арганізма ў неспрыяльных умовах, пасля перанесеных захворванняў, для павышэння імунітэту, нармалізацыі функцыянальных парушэнняў у арганізме.

Вылучаюць тры асноўныя віды ўздзеяння БАДаў на арганізм: ачышчэнне — вылучэнне таксінаў, соляў цяжкіх металаў, свабодных радыкалаў і г.д., напаўненне — перамаганне дэфіцыту мікра- і макраэлементаў, вітамінаў, амінакіслот, поліненасычаных тлустых кіслот і г.д., і аднаўленне — стабілізацыя функцый усіх органаў і сістэм, абмену рэчываў. Кожная дабаўка павінна валодаць практычна ўсімі трыма вартасцямі, праўда, у адных пераважаюць адны, а ў другіх — іншыя.

Існуе некалькі правілаў выкарыстання БАДаў:

1. Практычна здаровым людзям варта аддаваць перавагу БАДам са шматбаковым уплывам на арганізм — вітамінна-мінеральныя комплексы.

2. Асобам з хранічнымі захворваннямі БАДы прызначаюць толькі пасля абследавання і кансультацыі са спецыялістам. Добры вынік можа быць дасягнуты пры правільным падборы лекавага сродку, БАДа і вытрымліванні адпаведнай дыеты.

3. Прыём БАДаў па падказцы суседкі можа прывесці да страты грошай, часу і прагрэсавання захворвання.

# З вітамінамі на «вы»

**Падчас прыгатавання ежы амаль поўнасцю разбураецца вітамін С, напалову — вітамін Е і вітаміны групы В. Паступовая замарожванне і працяглае захоўванне прадуктаў таксама зніжаюць канцэнтрацыю ўсіх вітамінаў у ежы. Працяглае знаходжанне на святле губіць вітаміны А і Е, а кантакт з кіслародам непрыймальны для вітамінаў А, Е і В6. Праз трое сутак захоўвання прадуктаў у халадзільніку страчваецца каля 30 працэнтаў вітаміну С, а пры пакаёвай тэмпературы — каля 50 працэнтаў.**

☑ Вітамінаў С, Е і селену курцам патрабуецца ў 2 разы больш, чым тым, хто не курыць. Аматары спіртных напояў губляюць шмат вітамінаў В1, В6 і магнію.

☑ Працяглы прыём антыбіётыкаў прыводзіць да дэфіцыту вітамінаў С і В2, транквілізатараў і снатворных — вітамінаў групы В, абязбольвальных — вітаміну С і фолієвай кіслаты, кальцыю, магнію, селену.

☑ Пры стрэсе, нервовым напружанні патрабуецца больш біятыну, вітамінаў В1, В2, С і хрому. Пры недахопе бялку ў ежы парушаецца засваенне вітамінаў В2, С, нікацінавай кіслаты, парушаецца пераўтварэнне бэта-караціну ў вітамін А.

☑ Дзецям і падлеткам неабходны збалансаваныя вітамінна-мінеральныя комплексы, спецыяльна распрацаваныя для розных узроставых груп.

☑ Пры падлеткавых высыпках рэкамендуюцца дадатковыя дозы вітамінаў А, В2, С, біятыну, цынку, кальцыю.Тым, у каго вельмі сухая скура, выпадаюць валасы, слаяцца пазногці, патрабуецца дадатковае ўжыванне вітамінаў А, Е, С, цынку і селену.

☑ Людзям, якія маюць кантакт з радыяцыйным уздзеяннем, неабходна ўжыванне вялікіх дозаў вітамінаў Е, С, А і селену.

**Вядучая рубрыкі Святлана БАРЫСЕНКА.**

## СЁННЯ

**Сонца**

| | Усход | Заход | Даўжыня дня |
|---|---|---|---|
| Мінск — | 5.00 | 21.31 | 16.31 |
| Віцебск — | 4.42 | 21.28 | 16.46 |
| Магілёў — | 4.50 | 21.21 | 16.31 |
| Гомель — | 4.55 | 21.09 | 16.14 |
| Брэст — | 5.25 | 21.45 | 16.29 |
| Гродна — | 5.16 | 21.37 | 16.12 |

**Месяц**

*Апошняя квадра.*
*Месяц у сузор'і Шаляў.*

**Імяніны**

*Пр. Вольгі, Марыі, Таццяны, Аляксея, Андрэя.*
*К. Ядвігі, Аляксея, Багдана.*


Фота Марыны БЕГУНКОВАЙ.




## Дзве даты — 17 ліпеня

**1919 год** — спыніў сваю дзейнасць урад Літоўска-Беларускай ССР. Улада на неакупаванай палякамі тэрыторыі ЛітБела перайшла ў рукі Мінскага губернскага ваенна-рэвалюцыйнага камітэта.



**1942 год** — пачалася Сталінградская бітва — адна з найбуйнейшых у Другой Сусветнай вайне. Бітва пад Сталінградам доўжылася 200 дзён — яна закончылася 2 лютага 1943 года. Фашысцкі блок страціў на берагах Волгі забітымі, параненымі, палоннымі, прапаўшымі без звестак амаль 1,5 млн чалавек — чвэрць усіх сваіх узброеных сіл, якія былі задзейнічаны на савецка-германскім фронце. Сталінградская бітва ўнесла рашаючы ўклад у дасягненне карэннага пералому ў ходзе не толькі Вялікай Айчыннай, але і ўсёй Другой Сусветнай вайны — Чырвоная Армія вырвала ў праціўніка стратэгічную ініцыятыву і ўтрымлівала яе да канца вайны.

## Цытата дня:

*«Толькі рука сябра можа вырваць шыпы з сэрца».*

**Клод Адрыян Гельвецый (1715—1771), французскі філосаф.**

# ТРАВА

Свет і сусвет чалавека

**У славянскім фальклоры шмат паданняў аб з'яўленні лекавых траў. Вось адно з іх: «Бог намаляваў на зямлі выяву чалавека і паставіў да яго сабаку і вартаўніка. Да сабакі прыйшоў чорт і стаў спакушаць яго, кажа: «Ты пакінь сваю варту, ты зараз нічым не накрыты, а я табе за гэта дам цёплае футра». Собака адышоў ад намяляванай выявы, а чорт схапіў «чалавека» і нанёс «яму 70 ранаў. Бог убачыў гэта і стварыў супраць кожнай раны 70 лекавых раслін».**

- Людзей, якія валодалі майстэрствам лячыць з дапамогай траў, звалі знахарамі, траўнікамі, зялейнікамі, травазнямі. Цікава, што ў перакладзе з грэчаскай мовы тэрмін «фармаколаг» азначае «знахар». Знахары перадавалі свае сакрэты з пакалення ў пакаленне, сваім нашчадкам.
- Працаёмістая апрацоўка лекавых раслін (збіранне на досвітку ці ўначы, сушка, вымочванне, пераціранне і г.д.) патрабавала пэўных навыкаў і здольнасцяў, ад якіх залежаў эфект уздзеяння на хворага чалавека.
- Калі вы звяртаецеся па дапамогу да народных лекараў, трэба ведаць, што знахар ніколі не аддасць вам лекавы сродак (настой ці парашок) у «сваім» посудзе. Неабходна з сабой прынесці ёмістасць, куды яго можна перасыпаць ці пераліць.
- Лічыцца, што за лекі, атрыманыя ад лекара, нельга казаць «дзякуй», інакш яго ўжыванне не дасць станоўчых вынікаў.
- На славянскіх землях свята траў і кветак — Сёмуху, Зялёныя святы — наладжвалі на сёмым тыдні пасля дня вясенняга раўнадзенства (21 сакавіка). З прыходам хрысціянства гэты дзень таксама атрымаў назву Тройца і стаў святкавацца праз сем тыдняў пасля святкавання Вялікадня. Таксама, як і хаты, вароты, калодзежы і г.д., храмы пачалі ўпрыгожваць галінкамі маладой бярозы, клёну, аерам і г.д.
- Святкаванне дня — найбліжэйшай нядзелі перад Вялікаднем — Вербнай нядзелі — зноў-такі было названа ў гонар расліны (вярбы). Гэта расліна самай першай абуджаецца пасля зімовага сну, пускаючы першыя кветкі — шэрыя пупышкі, «коцікі».
- Дзень святкавання Купалля стаў асноўным святам у летнім цыкле святаў. І нават сёння мы расказваем сваім дзецям і ўнукам паданне пра папараць-кветку.
- Лічылася, што на Купалле травы становяцца асабліва чарадзейнымі.
- Самымі цудадзейнымі травамі лічыліся Адамава галава і Пятроў крыж — ад усіх «страстей и болестей».
- Народныя знахары былі ўпэўнены, што ў кожнага чалавека ёсць свая расліна-лекар. Яе можна знайсці толькі з дапамогай асабістай інтуіцыі. Для гэтага неабходна з усёй безлічы раслін абраць тую, якая вам бліжэй да сэрца, паважаць і даглядаць яе, і расліна ў цяжкі для вас час адкажа вам тым жа — дабрынёй і дапамогай.
- Такую расліну можна знайсці не абавязкова ў садзе ці на агародзе, але нават і ў вашай гарадской кватэры. Нездарма лекары раяць паліваць пакаёвыя расліны з наступнымі словамі: «Сад мой райский пред Богом мал, чтобы с Божьей помощью не пропал. Аминь».
- Прыкмячалі, калі ад траў раніцай ідзе большы за звычайны пах — будзе дождж.

**Аксана КАТОВІЧ, Янка КРУК.**

## Усміхнёмся!

**— Калі я абвясціў жонцы, што гэтым летам мы не паедзем у Ніцу, яна страціла прытомнасць.**

**— Ну, і як ты прывёў яе ў прытомнасць?**

**— Вельмі проста — сеў на яе новы капялюшык!**

☺

Adidas — найбуйнейшы сусветны вытворца адзення для паездкі ў цягніках і паходаў да ларка за півам.

☺

**Жанчына-ўрач з праступджаным горлам ціха кажа пацыенту, які ўвайшоў:**

**— Распранайцеся...**

**— А вы? — ціха пытаецца пацыент.**

☺

— Ну чаму, толькі я ажаніўся, і дзяўчаты на вуліцы самі сталі падыходзіць і знаёміцца?!

— Тлумачу! Калі ты жанаты, у цябе чыстае і папрасаванае адзенне, плюс ты накормлены і паголены.



# ПЯТНІЦА, 24 ЛІПЕНЯ

**5.40 Серыял «Як сказаў Джым».**
**6.00, 7.00, 8.00, 9.00, 12.00, 13.00, 14.00, 15.00, 16.00, 17.00, 18.00, 19.00, 23.55** Навіны.
**6.05, 1.35** Дзень спорту.
**6.10, 7.05, 8.10** «Добрай раніцы, Беларусь!».
**6.45, 7.45** Зона Х.
**7.30, 11.50** Дзелавое жыццё.
**8.20** Гатуем разам.
**8.35** Сфера інтарэсаў.
**9.05, 15.55** «Беларусь. Гісторыя Перамогі».
**9.10, 19.55 Серыял «Карамболь».**
**9.55 Серыял «Тэрыторыя прыгажосці».**
**10.40, 17.55 Серыял «Новы рускі раманс».**
**11.35** «OFF STAGE LIFE».
**12.10 Серыял «Эўрыка».**
**13.05 Серыял «Героі».**
**13.45** «Мая праўда». «М. Круг. Жыццё ў стылі 90-х».
**14.30 Серыял «Клініка».**
**15.15, 19.20** Навіны рэгіёна.
**15.25** «Нябачны фронт».
**16.05 Серыял «Нацыянальны набытак».**
**16.50** «Жыццё як жыццё». «Я стала ахвярай прыгажосці».
**19.30** «Зона Х». Вынікі тыдня.
**21.00** Панарама.
**21.50 Серыял «Зорны крэйсер «Галактыка».**
**23.35 Драма «Морфій».**

**6.00, 6.30, 7.00, 7.30, 8.00, 8.30, 9.00, 11.00, 13.00, 16.00, 18.00, 20.30, 1.45** Нашы навіны.
**6.05** «Наша раніца».
**9.05 «Рыжая». Серыял.**
**10.05 «Бурштынавы барон». Серыял.**
